УДК 94(437. 3) “1939/1945”

# СТАНОВІШЧА РУСІНАЎ У СЛАВАЦКАЙ РЭСПУБЛІЦЫ Ў 1939–1945 гг.

***А. С. Кандраценка***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь,* kandratikas@gmail. com

У артыкуле разглядаецца становішча русінскай меншасці ў Славацкай Рэспубліцы ў 1939–1945 гг. Асобая ўвага надаецца русінска-славацкім узаемаадносінам і вырашэнню русінскага пытання. Вызначаны прававы статус, роля і месца русінаў у славацкай палітычнай сістэме. Акрэслена дзейнасць культурна-асветніцкіх і адукацыйных установаў. Ахарактарызавана праблема саманазвы русінскага насельніцтва. Русіны мелі прадстаўніцтва ў славацкім парламенце. Пры гэтым яны не мелі такой вызначанай палітычнай пазіцыі, як, напрыклад, венгерская і нямецкая меншасці. Стварэнне Славацкай Рэспублікі і захоп Венгрыяй Падкарпацкай Русі азначалі пэўную ізаляцыю мясцовага русінскага насельніцтва і далейшага паслаблення сваіх палітычных амбіцый.

***Ключавыя словы:*** Славацкая Рэспубліка; Падкарпацкая Русь; русіны; русінска-славацкія ўзаемаадносіны; нацыянальныя меншасці.

# ПОЛОЖЕНИЕ РУСИНОВ В СЛОВАЦКОЙ РЕСПУБЛИКЕ В 1939–1945 гг.

***А. С. Кондратенко***

*Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости, 4 220030, г. Минск, Беларусь,* kandratikas@gmail. com

В статье рассматривается положение русинского меньшинства в Словацкой Республике в 1939–1945 гг. Особое внимание уделяется русино-словацким взаимоотношениям и решению русинского вопроса. Определены правовой статус, роль и место русинов в политической системе Словакии. Описана деятельность культурно-просветительских и образовательных учреждений. Охарактеризована проблема самоидентификации русинского населения. Русины имели представительство в словацком парламенте. В то же время они не имели такой определенной политической позиции, как, например, венгерское и немецкое меньшинства. Создание Словацкой республики и захват Подкарпатской Руси Венгрией означало определенную изоляцию местного русинского населения и дальнейшее ослабление их политических амбиций.

***Ключевые слова:*** Словацкая Республика; Подкарпатская Русь; русины; русино-словацкие взаимоотношения; национальные меньшинства.

# THE POSITION OF THE RUSYNS IN THE SLOVAK REPUBLIC IN 1939–1945

***A. Kandratsenka***

*Belarusian State University,*
*Avenue Nezaleznasti, 4 220030, Minsk, Belarus,* kandratikas@gmail. com

The article examines the situation of the Ruthenian minority in the Slovak Republic in 1939–1945. Particular attention is paid to Rusyn-Slovak relations and the solution of the Rusyn issue. The legal status, role and place of Rusyns in the political system of Slovakia have been determined. The activities of cultural and educational institutions are described. The problem of self-identification of the Ruthenian population is characterized. Rusyns had representation office in the Slovak parliament. At the same time, they did not have such a definite political position as, for example, the Hungarian and German minorities. The creation of the Slovak Republic and the seizure of Subcarpathian Rus by Hungary meant a certain isolation of the local Ruthenian population and a further descent of their political ambitions.

***Key words:*** Slovak Republic; Subcarpathian Rus; Rusyns; Rusyn-Slovak relations; national minorities**.**

Рашэнні Мюнхенскай канферэнцыі, а затым абвяшчэнне аўтаноміі Славакіі падштурхнулі падкарпацкіх палітыкаў Чэхаславакіі да рашучых дзеянняў. 7 кастрычніка 1938 г. у Ужгарадзе была створана Карпатаруская рада, якая запатрабавала ў чэхаславацкага кіраўніцтва аўтаномнага статусу для Падкарпацкай Русі. Шляхам перамоў Прага пагадзілася на аўтаномію. 11 кастрычніка 1938 г. быў сфармаваны першы аўтаномны ўрад пад кіраўніцтвам прэм’ер-міністра А. Бродзія.

Створаны аўтаномны ўрад, у якім пераважылі правенгерскія настроі, не адпавядаў планам Германіі, якая ўспрымала Падкарпацкую Русь як яшчэ адзін інструмент для падзелу Чэхаславакіі. 26 кастрычніка 1938 г. А. Бродзій, не без дапамогі нямецкай разведкі, быў арыштаваны ў Празе па абвінавачанні ў дзяржаўнай здрадзе на карысць Венгрыі [1, с. 51]. Новым прэм’ер-міністрам аўтаномнага ўрада стаў украінафіл А. Валошын.

2 лістапада 1938 г. міністры замежных спраў Германіі і Італіі падпісалі ў Вене пагадненне аб новай чэхаславацка-венгерскай мяжы т. зв. «Першы Венскі арбітраж». Па яго рашэнню ўрад Чэхаславакіі перадаваў Венгрыі паўднёвую частку Славакіі і поўдзень Падкарпацця з гарадамі Ужгарад, Мукачава і Берагава. Адміністрацыйным цэнтрам аўтаномнай Падкарпацкай Русі стаў Хуст. Па выніках Першага Венскага арбітражу Славакія страціла 10 390 кв. км. з насельніцтвам у 854 217 чалавек, сярод якіх былі і прадстаўнікі русінскай меншасці [16, s. 31].

У выніку акупацыі Чэхаславакіі нямецкімі войскамі ў сакавіку 1939 г. быў створаны Пратэктарат Багемія і Маравія, а на славацкіх землях была абвешчана незалежнасць Славацкай Рэспублікі. У гэтых умовах 15 сакавіка 1939 г. аўтаномны ўрад на чале з А. Валошыным абвясціў незалежнасць Карпацкай Украіны. У гэты ж дзень венгерскія войскі

перайшлі да паўнамаштабнага наступу ўглыб яе тэрыторыі. Да 18 сакавіка Карпацкая Украіна была цалкам акупіравана Венгрыяй.

23 сакавіка 1939 г. венгерская армія ўварвалася на тэрыторыю Усходняй Славакіі. Нямецкае кіраўніцтва вырашыла ўмяшацца ў славацка-венгерскі канфлікт і загадала двум бакам пайсці на мірныя перамовы. Пад ціскам Берліна славацкі і венгерскі бакі дамовіліся спыніць баявыя дзеянні і стварыць нейтральную зону паміж дзвюма арміямі. Па выніках «Малай вайны» Славацкая Рэспубліка страціла Сабранецкую акругу і частку акругі Свіна з русінскім насельніцтвам, што складала плошчу ў 1056 кв. км. і ўключала 74 вёскі з насельніцтвам у 40 777 чалавек [6, s. 100].

У новастворанай Славакіі па дадзеных перапісу насельніцтва 1940 г. пражывалі 61 762 прадстаўнікоў русінскай народнасці. Яны пераважна пражывалі ў Шарышска-Зэмплінскай жупе. Па афіцыйным дадзеным русіны складалі каля 71 % жыхароў Медзілаборцкага краю [14, s. 139]. Гэты рэгіён адносіўся да ліку эканамічна неразвітых [9, s. 49].

У працэсе апрацоўкі Дзяржаўным статыстычным дэпартаментам дадзеных перапісу насельніцтва 15 снежня 1940 г. узнікла праблема саманазвы русінскай народнасці. Жыхары паўночна-ўсходняй Славакіі называлі сябе русінамі, руснакамі, рускімі, гуцуламі, украінцамі ці маларусамі. У сувязі з гэтым 30 кастрычніка 1941 г. Дзяржаўны статыстычны дэпартамент выдаў распараджэнне, у якім было прадпісана запісваць вышэйзгаданыя народнасці адной назвай – русінскай [14, с. 34].

Адносіны паміж славацкімі ўладамі і русінскай меншасцю характарызаваліся ўзаемным недаверам. Кіраўніцтва Славакіі падазравала русінаў у супрацоўніцтве з венграмі і лічыла іх прыхільнікамі бальшавізму. Яно баялася, што Венгрыя выкарыстае русінскае пытанне, каб далучыць да сябе тэрыторыю іх пражывання. Гэта стала падставай для правядзення Братыславай фактычна антырусінскай палітыкі. Яна праяўлялася ў стварэнні перашкод для разгортвання русінскага нацыянальнага руху, ігнараванні сацыяльна-эканамічных праблем і адмаўленні этнічнай прыналежнасці меншасці [8, s. 117].

21 ліпеня 1939 г. была прынята Канстытуцыя Славацкай Рэспублікі, якая рэгулявала становішча этнічных груп. Нацыянальным меншасцям было гарантавана права на палітычную і культурную арганізацыю пад уласным кіраўніцтвам. Паводле Канстытуцыі яны маглі прымаць удзел у грамадска-палітычным жыцці краіны шляхам рэгістрацыі сваёй партыі [15].

Палітычныя амбіцыі русінаў былі звязаныя з ідэяй стварэння ўласнай партыі замест раней забароненай Рускай народнай рады. Інтарэсы русінскай меншасці ў славацкім парламенце прадстаўлялі грэка-каталіцкі святар А. Сімко і настаўнік Г. Гарняк (з 1941 г. – М. Банько). 1 лістапада 1939 г. у Прэшаве адбылася сустрэча 60 прадстаўнікоў русінскай меншасці, дзе былі агучаны прапановы аб стварэнні ўласнай партыі і яе структур. Браціслава заклікала праявіць стрыманасць у гэтым пытанні да ўступлення ў сілу закона аб палітычных партыях нацыянальных меншасцей [3, s. 249]. Такім чынам, у 1939 г. русінскія палітыкі не атрымалі дазвол славацкіх улад на стварэння ўласнага палітычнага аб'яднання.

Кіраўнік адміністрацыі Шарышска-Зэмплінскай жупы Ш. Гашык аргументаваў гэта тым, што русіны не маюць адзінага кіраўніцтва, з якім можна было б супрацоўнічаць у палітычнай сферы. Ён сцвярджаў, што русінскае пытанне з'яўляецца ў першую чаргу сацыяльным, а не нацыянальным. На яго думку для гэтага неабходна было павялічыць колькасць працоўных месцаў і пасіліць дысцыпліну [11, s. 299–300]. Вырашэнне русінскага пытання Гашыку бачылася ў сістэматычнай і паступовай славакізацыі русінаў, сканцэнтраванай у Медзілаборцкім і Вышнісвідніцкім краях.

У канцы 1940 г. прадстаўнікі русінскай меншасці актывізавалі сваю грамадска-палітычную дзейнасць. Закон аб палітычных партыях нацыянальных меншасцей ад 15 мая 1940 г. мусіў дазволіць зарэгістраваць партыю [17]. 1 снежня 1940 г. русіны ўручылі славацкаму міністру ўнутраных спраў А. Маху мемарандум з патрабаваннямі аб рэгістрацыі палітычнай партыі, выданні падручнікаў на русінскай мове, дазволе на выпуск газет, большым прадстаўніцтве ў дзяржаўных органах і інш. З пералічанага славацкі ўрад дазволіў толькі выхад русінскага штотыднёвіка «Новое время», першы нумар якога выйшаў 14 снежня 1940 г., апошні – летам 1944 г. Гэта выданне насіла радыкальны характар, задачай якога было ўздзейнічаць у праружымным духу на русінскае насельніцтва ўсходняй Славакіі [5, s. 16].

У Славацкай Рэспубліцы дзейнічалі культурна-асветніцкія і адукацыйныя арганізацыі русінскай меншасці: таварыства ім. А. Духновіча і «Прасвіта». У Медзілаборцах дзейнічаў «Рускі скаўт» пад кіраўніцтвам рускага эмігранта М. Белінскага, які арганізоўваў летнія лагеры для моладзі ў Палоце. Таварыствы ім. А. Дабранскага ў Браціславе і Вагабунт былі студэнцкімі арганізацыямі [7, с. 285].

У кастрычніку 1940 г., на змену Ш. Гашыку прыйшоў новы кіраўнік Шарышска-Зэмплінскай жупы А. Дудаш. Ён працягнуў працу свайго папярэдніка ў вырашэнні русінскага пытання шляхам славакізацыі рэгіёна [12, s. 128]. Адной з задач, на яго думку, было ўмацаванне славацкіх пазіцый у грэка-каталіцкай царкве, якая з'яўлялася ідэйным цэнтрам русінізацыі рэгіёна [10, s. 156]. Напрыклад, аўтары прэшаўскай газеты «Славацкая свабода» зазначалі, што большасць грэка-каталіцкага насельніцтва ўсходняй Славакіі з'яўляліся славакамі, а не русінамі [2, с. 180–181].

Вынікі снежаньскага перапісу насельніцтва былі выкарыстаны славацкім урадам для памяншэння колькасці русінскіх школ ва ўсходняй Славакіі шляхам славакізацыі. Русінская меншасць на 1940/1941 гг. мела два дзіцячыя садкі, 165 народных школ з 368 класамі, адну гарадскую школу з 6 і 2 сярэднія школы з 11 класамі. Аднак, у 75 школах і ў 113 класах у якасці мовы навучання была ўведзена славацкая [7, s. 287]. Працэс славакізацыі датычыўся і іншых адукацыйных устаноў. У 1940 г. у Міхайлаўцах была адчынена славацкая грэка-каталіцкая настаўніцкая семінарыя, а Прэшаўскую русінскую (украінскую) замест гэтага неабходна было ліквідаваць. Навучанне адбывалася толькі на славацкай мове, забаранялася выкарыстанне кірыліцы і роднай (то бок неславацкай) мовы ў набажэнствах.

Уступленне Славацкай Рэспублікі ў вайну супраць Савецкага Саюза аказала ўплыў на настроі русінскай меншасці, паколькі яна не прымала ідэю славацкай дзяржавы, пабудаванай на нацыяналістычнай ідэалогіі. Русінаў не без прычыны натхнялі камуністычныя лозунгі аб сацыяльнай справядлівасці. Гэта была рэакцыя на сталыя спробы абмежаваць русінаў у правах, на адсутнасць свабоднай прэсы, сваёй палітычнай партыі.

Пытанне аб стварэнні ўласнай партыі русінаў зноў абвастрылася толькі ў 1942 г., выклікаўшы палеміку як сярод дзяржаўных чыноўнікаў, так і сярод русінскіх актывістаў. Адной з прапаноў было ўключэння русінаў у шэрагі Глінкавай славацкай народнай партыі. Дадзеную думку асабліва падтрымліваў дэпутат славацкага парламента М. Банько і яго асяроддзе [11, s. 298]. А. Дудаш, другі кіраўнік Шарышска-Зэмплінскай жупы, крытыкаваў славацкі бок у некампетэнтнасці падыходу да русінскага пытання, што магло б прывесці да пераходу палітычнага кіраўніцтва русінаў пад кантроль венграў. Дудаш быў упэўнены, што русіны маюць славацкае паходжанне і характар [4, s. 228].

Пералом у вайне на Усходнім фронце ў 1943 г. даў пачатак руху супраціву русінскага насельніцтва Славакіі. Да гэтага часу мелі перавагу індывідуальныя, больш пасіўныя формы барацьбы супраць нацысцкай Германіі і яе саюзніцы – Славацкай Рэспублікі. Восенню 1943 г. у кабінеце прэшаўскага ўрача Д. Райковіча адбылася сустрэча русінскіх дзеячаў супраціву. Імі быў заснаваны Карпатарускі аўтаномны савет нацыянальнага вызвалення. Задачай арганізацыі было пашырэнне ідэй супраціву сярод русінаў і дапамога ў разгортванні партызанскага руху ў рэгіёне [13, s. 122].

Перамены на савецка-нямецкім фронце і рост руху супраціву ў краінах Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы ў 1944 г. прывялі да змен ва ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў Славакіі. Русінскае пытанне адышло на другі план. Славацкае нацыянальнае паўстанне, а потым і крах Першай Славацкай Рэспублікі далі новы віток гісторыі русінскай меншасці ў аднаўленай Чэхаславакіі і Закарпацкай Украіне.

Такім чынам, русінская меншасць у Славацкай Рэспубліцы так і не здолела стварыць уласную партыю. Неабходна адзначыць паслабленне палітычнай актыўнасці русінаў у параўнанні з канцом 1930-х гг. На гэта паўплывалі недаверлівы характар русінска-славацкіх узаемаадносін, частыя абвінавачанні русінаў у супрацоўніцтве з венграмі і камуністамі, слабае прадстаўніцтва ў дзяржаўных органаў і працэс славакізацыі. На нашу думку, недастатковая актыўнасць русінскіх палітыкаў і кантроль за рэгіёнам з боку славацкіх уладаў адыгралі сваю ролю ў становішчы русінаў у Славацкай Рэспубліцы 1939–1945 гг.

### Бібліяграфічныя спасылкі


1. Гай-Нижник П. Карпатська Україна (Підкарпатська Русь) 1938–1939 рр. як одна із «розмінних монет» Мюнхенського договору // Збірник наукових праць «Гілея: науковий вісник». Вип. 139 (№12). Ч. 1. Історичні науки. 2018. С. 48–56.
2. Казак О. Русинский вопрос в оценках прешовской газеты «Словацкая свобода» (1939–1944 гг.) // Славянский альманах. 2016. № 3–4. С. 176–182.
3. Baka I. Politický systém a režim Slovenské republiky v rokoch 1939–1940. Bratislava: Vojenský historický ústav, 2010. 322 s.
4. Dudáš A. Rusínska otázka a jej úzadie. Buenos Aires: Zahraničná Matica slovenská, 1971. 238 s.
5. Hlavinka J. Týždenník „Novoje vremja“ ako prejav rusínskej otázky v rokoch 1940–1944. Bratislava: Ústav pamäti národa. 2008. № 3. S. 4–16.
6. Janek I. The History of the Slovak-Hungarian «Little War» and Its Interpretations in National Histories // Prague Papers on the History of International Relations, 2. Praha: Univerzita Karlova, Ústřední knihovna, 2015. P. 85–101.
7. Konečný S. Rusínska a ukrajinská menšina po vzniku prvej Slovenskej republiky //Slovenská republika 1939–1945 očami mladých historikov. Zv. 4. Zborník príspevkov z

medzinárodnej vedeckej konferencie Banská Bystrica 14. – 15. 4. 2005. Banská Bystrica: Ústav vedy a výskumu UMB, 2005. S. 283–291.
8. Koval' P. Otázka slovensko-rusínskych etnických hraníc v čase formovania slovenskej štátnosti // Slovensko medzi 14. Marcom 1939 a salzburskými rokovaniami. Prešov: Universum, 2007. S. 112–126.
9. Lacko M. Rusínska problematika vo fondoch armádneho spravodajstva 1940–1941. – Ústav pamäti národa. 2007. №3. S. 46–53.
10. Lacko M. Slovenská republika 1939–1945. Bratislava: Perfekt, Ústav pamäti národa, 2008. 205 s.
11. Pekár M. Rusínska otázka na Slovensku v rokoch 1939–1945 a alternatívy jej riešenia // Slovenská republika 1939–1945 očami mladých historikov. Zv. 4. Zborník príspevkov z medzinárodnej vedeckej konferencie Banská Bystrica 14. – 15. 4. 2005. Banská Bystrica: Ústav vedy a výskumu UMB, 2005. S. 292–302.
12. Podolec O. Postavenie národnostných menšín v Slovenskej republike (1939–1945) // Z dejín demokratických a totalitných režimov na Slovensku a v Československu v 20. storočí : historik Ivan Kamenec 70–ročný. Bratislava: Historický ústav SAV, 2008. S. 115–130.
13. Pop I. Malé dejiny Rusínov. Bratislava: Združenie inteligencie Rusínov Slovenska, 2010. 140 s.
14. Šprocha B., Tišliar P. Demografický obraz Slovenska v rokoch 1938–1945. Bratislava: Muzeológia a kultúrne dedičstvo, 2016. 199 s.
15. Ústavný zákon zo dňa 21. júla 1939 o ústave Slovenskej republiky // Slovenský zákonník 1939. № 185. S. 375–384.
16. Viedenská arbitráž 2. novembrer 1938: Dokumenty II., Okupácia (2. novembrer – 14. marec) / zost. L. Deák. – Bratislava: Matica slovenska, 2003. 304 s.
17. Zákon zo dňa 15. mája 1940 o politických stranách národnostných skúpin // Slovenský zákonník 1940. № 121. S. 194–198.